зом, учащиеся сами могут определить наличие фантастического в сюжете и классифицировать героев. Проанализировав все истории, необходимо выделить фантастические элементы, присутствующие в тексте, которые также можно отобразить в интеллект-карте. Любовь и доброту необходимо исследовать через призму отношений героев. Интеллект-карта позволяет отобразить положительных и отрицательных героев, т. е. носителей и противников зла в сказке. Отображение цитат позволяет найти их в тексте, что впоследствии поможет определить о ком идёт речь в той или иной цитате.

**Заключение.** Интеллект-карта — ключ к наглядности урока. Учитель при помощи этой инновационной технологии может приобщить учащихся к созданию этих пособий, для того, чтобы наглядно представлять образную характеристику. Учащиеся могут и сами создавать и демонстрировать их в процессе анализа сказок. Красочность, лаконичность, краткость и точность в схемах помогают полно исследовать произведение, выполнить творческие задания.


**Список цитируемых источников**

1. Литература. Рабочие программы. Предметная линия учебников. 5—9 классы / В. Я. Коровина [и др.] ; под ред. В. Я. Коровиной. — 2-е изд. — М. : Просвещение, 2014. — 354 с.
2. Сказки русских писателей [Электронный ресурс] / А. С. Пушкин [и др.]. — М. : Изд-во Юрайт, 2020. — 261 с. — (Памятники литературы). — Режим доступа: https://urait.ru/bcode/457420 . — Дата доступа: 04.04.2016.



УДК 821.161.3-1«19»



**К. П. Шкут**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы, Рэспубліка Беларусь*


## МАТЫЎ ШЛЯХУ Ў ПАЭЗІІ XIX СТАГОДДЗЯ

**Уводзіны.** Тэма шляху, падарожжа з'яўляецца неад'емнай часткай жыцця кожнага чалавека. Яна мае вялікае значэнне ў літаратурных творах і займае важнае месца ў творчасці пісьменнікаў XIX стагоддзя.

Матыў шляху дапамагае лепш раскрыць унутраны свет героя, таму што менавіта стан падарожніка дапамагае яму разважаць пра сэнс жыцця, думаць пра планы на будучыню, прымушае адчуць прыгажосць акаляючага пейзажу, пазнаць нешта новае. Словы «дарога», «шлях» мнагазначныя: яны могуць абазначаць не толькі адрэзак прасторы паміж якімі-небудзь пунктамі, але і этапы жыцця як асобнага чалавека, так і цэлай нацыі.

У беларускай міфалогіі дарога «ўвасабляе сувязь з іншасветам і светам памерлых. У народнай традыцыі звязана са светам памерлых і нячыстай сілай. Смерць разумелася як выправа чалавека "ў апошні шлях". Патэнцыяльная небяспека дарогі для чалавека тлумачылася яе сувяззю з нячыстай сілай. Знакавы статус дарогі тлумачыць яе выкарыстанне ў шэрагу магічных практык. Вобраз яе шырока выкарыстоўваецца ў розных жанрах беларускага фальклору» [1, с. 140—141].

**Асноўная частка.** Для многіх герояў беларускаай паэзіі XIX стагоддзя шлях, падарожжа — гэта своеасаблівая форма існавання, быцця. Пра беларускага паэта Яна Аношку ў 1866 г. расійская «Иллюстрированная газета» змясціла артыкул рускага бібліёграфа Р. Генадзі, які пісаў, што «першы народны паэт Беларусі» Ян Аношка памёр «у маладых гадах», што гэта быў «бедны жабрак, які ўсё жыццё правёў у вандраваннях ад вёскі да вёскі», што ён «не ведаў ні дома, ні родных». Верш «Муза з вясковае далі» Аношка літаральна пачынае словамі пра дарогу «Спяваю ў сваім я паходзе…». Гэта падкрэслівае той факт яго біяграфіі, што ён быў аматарам падарожжаў.

Аўтар дае апісанне таго, што сустракалася яму на шляху, увасабляе сялянскую душу, тым самым надае спатканню з сялянамі падчас падарожжа вялікае значэнне, яму ўсё гэта дарага і люба.

Я слаўлю і цноту, і працу
Не дзеля салонных прызнанняў.
З душой вашай шчырай спаткацца
Мне дарага-люба, сяляне! [2, с. 32].

Паэт паказаў у гэтым вершы, што яго душа шукала спакою, прытулку. Дарога ў гэтым кантэксце набывае філасофскі сэнс, яго душа «мітусіцца», не знаходзіць сабе месца, ён хвалюецца. У апошніх радках аўтар разважае пра лёс чалавека, гаворыць аб тым, што ў жыцці любога чалавека шмат пакут і няшчасцяў, што існаванне немагчыма без складанасцей, што нічога ў жыцці не бывае проста.


© Шкут К. П., 2021


Репозиторий БарГУ

Пазнаў я, што лёс чалавека,
Пакуль не ўкладзе на пагосце,
Вядзе праз пакуты і здзекі
Пад сцягам бязглуздае злосці [2, с. 33].

Вядомы беларускі паэт, аўтар верша «Зайграй, зайграй, хлопча малы…», Паўлюк Багрым апісаў жыццёвы шлях хлопчыка з Крошына, верагодна, выкарыстаўшы аўтабіяграфічныя звесткі. Аўтар асуджае ўладу, паноў, войны і разважае аб тым, кім ён будзе, які жыццёвы шлях яго чакае.

Дзе ж я пайду? Мілы Божа!
Пайду ў свет, у бездарожжа,
У ваўкалака абярнуся,
З шчасцем на вас азірнуся [3].

У творы прысутнічаюць перажыванні пра будучыню, аўтар не хоча расці, баіцца невядомай будучыні, хоча як мага больш заставацца малым, безклапотным.

Мне пастушком век ня быці,
А ў маскалях трудна жыці,
А я і расьці баюся,
Дзе ж я, бедны, абярнуся?

Ой, кажане, кажане!
Чаму ж ня сеў ты на мяне?
Каб я больш не падрос
Ды ад бацькавых калёс [3].

Такім чынам, у вершы Паўлюка Багрыма «Зайграй, зайграй, хлопча малы...» матыў дарогі раскрываецца ў жыццёвых перажываннях лірычнага героя.

Філасофскімі разважаннямі пра жыццёвы шлях напоўнены верш Яна Баршчэўскага «Наперадзе — вецер…». Тэма шляху адлюстроўваецца ўжо ў першых радках «Наперадзе — вецер. За ветрам — жытло…». Аўтар разважае пра шлях чалавечага жыцця, пра тое, як змяняецца светапогляд чалавека з яго ўзростам. Прысутнічае ўвасабленне сардэчнага цяпла, якое перамяшчаецца разам з чалавекам, куды б ён не пайшоў.

Наперадзе — вецер.
За ветрам — жытло,
Якое ніколі цябе не спазнае.
Аднойчы прыходзіць у сэрца цяпло —
І сувязь з утульнымі сценамі тае.
Ідзе не па сцежках – па спевах ідзе
Аматар, бы кветкі,
збіраць калыханкі [4].

Філасафічнасць верша Яна Баршчэўскага дазваляе задумацца над жыццём і хуткаплыннасцю яго.

Матыў шляху характэрны не толькі для літаратуры беларускага рамантызму, але і для еўрапейскага. Так, у вершы «Велосипедов дребезжание» англійскага паэта Артура Конан Дойля тэма шляху набывае сэнс успамінаў, настальгіі па роднаму дому, па родным краявідам  і памяці, якая захавалася ва ўсіх гэтых рэчах:

Велосипедов дребезжание,
И сельский дом, и чаепитие,
Прогулки по холмам, где хочется
Как можно дольше длить событие [5].

Аўтар, верагодна, успамінае дзяцінства, прагулкі на веласіпедзе, у яго ўяўленні ўсплываюць знаёмыя вобразы. Вясковы дом, узгоркі, возера, верас — усё гэта пакінула адбітак у яго памяці. Дойль апісвае усе тое, што дарыла яму душэўную цеплыню напрацягу доўгага часу:

*Езда вкруг озера по вереску,*
*Где ветрено с утра до вечера,*
*И камень, где сгубили странника,*
*И разговор от делать нечего…* [5].

У творы «Гвардия идет на прорыв» Артур Конан Дойль апісвае падзеі Грамадзянскай вайны 1918 года. У гэтым вершы дарога становіцца сімвалам захавання шчасця закаханых.

Паэт дае апісанне марскога патруля, які ішоў уздоўж родных берагоў, на якіх раней маглі адпачываць закаханыя, таксама ён гаворыць аб тым, што салдату з жанчынай важней быть у тым свеце, дзе ёсць каханне:

Она и он — во тьме ночной
Мурлычут позади меня
Мотивчик лёгкий, заводной.



Репозиторий БарГУ

При вспышке жёлтой, как жнитво,
Я заприметил невдали:
Солдат и женщина его,
Обнявшись, медленно прошли [6].

Такім чынам, дарога у вершы «Гвардия идет на прорыв» набывае не толькі значэнне шляху, але і сімвалізуе менавіта той шлях, які прайшлі людзі, каб абараніць каханне:

И, противостоя врагу,
Там стража молча берегла
Весёлый смех на берегу. [6].

У вершы «Возвращение Эвридики» А. Конан Дойль апісвае карабель, які загінуў з трымастамі членамі экіпажа ў апошні дзень свайго падарожжа 23 сакавіка 1876 года. Людзі, якія былі там, патанулі недалёка ад свайго дома, недалёка ад Партсмута. Дарога ў гэтым вершы сімвалізуе трагічнае, а менавіта смерць. Людзі амаль ужо дабраліся да дому, ужо пабачылі знаёмыя краявіды.

Здесь вы — на родине, здесь вы — не гости, —
Здравствуйте, Ва́рнер, и Хе́йлинг, и Хом! [7].

Яны былі ўжо думкамі дома *«Рядышком с домом их мысли витают: // Скоро увидят родные огни»,* але здарылася непапраўнае…

Судна пачало тануць. Капітан судна намагаўся зрабіць усё, каб знайсці выйсце, але беспаспяхова. Судна затанула.

После крушенья Ты утешенье,
Господи Боже, дай матерям!
Дай утешенье жене и невесте,
Дочери дай, — и услышишь их глас:
Наши мужчины, с нами вы вместе
В доме и в сердце — здесь и сейчас! [7]

Такім чынам, у гэтым вершы дарога апісваецца як трагічны шлях, апошні пункт прыпынку якога, — смерць.

Рэдзьярд Кіплінг таксама звярнуўся да тэмы шляху ў сваіх вершах. У вершы «За цыганской звездой» дарога з'яўляецца сімвалам кахання. Аўтар параўноўвае каханую цыгана з зоркай, за якой ён ідзе: *«А цыган идет, куда воля ведет, За своей цыганской звездой! А цыган идет, куда воля ведет, Куда очи его глядят, За звездой вослед он пройдет весь свет — И к подруге придет назад»* [8], а цыганская дачка таксама ўслед за каханым ідзе уначы *«А цыганская дочь — за любимым в ночь, По закону крови своей»* [8]. Аўтар заклікае ісці за сваім каханнем радкамі: *«И вдвоем по тропе, навстречу судьбе, Не гадая, в ад или в рай. Так и надо идти, не страшась пути, Хоть на край земли, хоть за край!»* [8].

**Заключэнне.** Такім чынам, матыў шляху ў паэзіі XIX стагоддзя ахоплівае шмат тэм, з'яўляецца скразным і праходзіць праз многія творы. Дадзены вобраз паўстае ў творах пра каханне, у філасофскіх разважаннях і ў перажываннях грамадскіх падзей. Дарога як тэма, матыў ці мастацкі вобраз узнікае ў вершах беларускіх паэтаў А. Аношкі, П. Багрыма, Я. Баршчэўскага, англійскіх класікаў А. К. Дойля, Р. Кіплінга.

**Спіс цытуемых крыніц**


1. Міфалогія беларусаў : энцыкладпедычны слоўнік / склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка ; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. — Мінск.: Беларусь, 2011. — 607 с.
2. Беларуская літаратура XIX стагоддзя. / уклад. К. А. Цвірка, І. С. Шпакоўскі, К. У. Антановіч ; навук. рэд. А. В. Мальдзіс. — Мінск.: Беларусь, 2013. — 861 с.
3. *Багрым, П.* Зайграй, зайграй, хлопча малы [Электронны рэсурс] / П. Багрым. — Рэжым доступу: https://knihi.com /Pauluk_Bahrym/Zajhraj,_zajhraj,_chlopca_maly.html. — Дата доступу: 01.05.2021.
4. *Баршчэўскі, Я.* Напярэдадні вецер… [Электронный ресурс] / Я. Баршчэўскі. — Рэжым доступу: http://rv-blr.com/verse /show/57753. — Дата доступу: 01.05.2021.
5. *Дойль, А. К.* Велосипедов дребезжание… [Электронны рэсурс] / А. К. Дойль. — Рэжым доступу: http://eng-poetry.ru /Poem.php?PoemId=11714. — Дата доступу: 05.2021.
6. *Дойль, А. К.* Ночной патруль [Электронны рэсурс] / А. К. Дойль. — Рэжым доступу: http://eng-poetry.ru/Poem.php? PoemId=11714. — Дата доступу: 02.05.2021.
7. *Дойль, А. К.* Возвращение Эвридики [Электронны рэсурс] / А. К. Дойль. — Рэжым доступу: http://eng-poetry.ru /Poem.php?PoemId=11714. — Дата доступу: 02.05.2021.
8. *Кіплінг, Р.* За цыганской звездой [Электронны рэсурс] / Р. Кіплінг. — Рэжым доступу: https://prosodia.ru/catalog/stikhotvorenie-dnya/redyard-kipling-i-mokhnatyy-shmel. — Дата доступу: 02.05.2021.


Репозиторий БарГУ